**Цэна асобнаго нумэру 5 кап.**

# НАША НІВА

**Выходзіць штс тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перасылкей і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м. — 65., на 1 мес. — 25 к. За граніцэй: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р., 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца па апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто ея прысылае. Можна такжэ падпісаць проэвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была недрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

**Год VII.** **11 (24) кастрычніка (акцябра) 1912 г.** **№ 41.**

## Да выбаршчыкоў.

Выбары у Вільні ад „рускаго населеньня“ да каторага прылічылі і беларусоў праваслаўных назначэны на 14 акцябра, гэтые выбары будуць ужо астатніе, хто дастане больш галасоў, той і пойдзе у губэрнскае выбарнае сабраньне. Грамадзяне! Ня слухайце тых, каторые хочуць разбіць галасы прогрэсістоў і разсылаюць запіскі, гдзе разам з іменем Л. І. Поволоцкаго пастаўлены Кавалюк і Пігулеўскі. Яны хапаюцца такім спосаам за полы прогрэсіста, каб пралезьці у выбаршчыкі. Падавайце галасы за поўны прогрэсіўны спісак!!!

| № по порядку. | № по списку. | | |
|---|---|---|---|
| 1 | 730 | Фамилія . . . | **Даниловичъ** |
| | | Имя . . . . | Борисъ |
| | | Отчество . . . | Леонтьевичъ |
| | | Званіе . . . . | Дворянинъ |
| 2 | 937 | Фамилія . . . | **Зегницъ** |
| | | Имя . . . . . | Карлъ |
| | | Отчество . . . | Давидовичъ |
| | | Званіе . . . . | Присяжн. Повѣренный |
| 3 | 2044 | Фамилія . . . | **Поволоцкій.** |
| | | Имя . . . . . | Леонидъ |
| | | Отчество . . . | Ивановичъ |
| | | Званіе . . . . | Присяжн. Повѣренный |

*Вільня*, 11 (*24*) *акцября 1912 г.*

Двайны туман неяк гусціцца і па нашай старонцы і па ўсей Эўропі. У нас, у Расеі ідуць выбары у Чацьвёртую Думу пры помачы пушчэных у палітыку сьвяшчэннікоў, а на Балканах грыміць гром вайны.

Хоць ешчэ дэпутаты ня выбраны, але ужо ясна, якая будзе новая Дума. Правых выбаршчыкоў у 4 разы больш, як левых, значыць, і правых дэпутатоў будзе найбольш. Гарады выбіраюць людзей паступовых, а вёскі пасылаюць па сваей палітычнай цемнаце правых, а калі разсудзіць добра, то мужыкам пры іх цяжкай долі, пры бязсудздзі і безпраўі трэба было-б якраз выбіраць людзей, каторые стаяць за свабоду і правы народу. Прычына гэтаго, што німа свабоды перадвыбарнай агітацыі, каб у кожнай воласці прогрэсіўные людзі маглі рабіць сходы, на каторых можна было б гаварыць мовы, як цяпер пазволена гэта сьвяшчэннікам, то і выбары пайшлі бы іначэй. З практыкі выбароў у паветах відаць было, што людзі у палітыцы не разбіраюць правай рукі ад левай, апрыч толькі меньшай часьці разумнейшых мужыкоў. Мы чэкалі ад Трэцяй Думы перамены жыцьця, а гэтай перамены німа і німа. Што будзе то будзе, але тые, што робяць выбары, бяруць на сябе вялікі адказ за будучыну Расеі.

Палудзенные славяне: Чорнагорцы, Сэрбы, Болгары, а разам з імі і Грэкі, хочуць адваеваць кавалкі сваей роднай зямлі, каторымі ўладзее інаверная ім Турцыя. А якраз Аўстро-Вэнгрыя даўно ўжо цэліцца на гэтые самые кавалкі. Пакуль, што нашы браты па крыві славяне бяруць турэцкіе малые гарадкі, глаўнай бітвы ешчэ не было. Калі славяне звconfigure Туркоў, то Аўстрыя не дапусціць іх забраць Македонію і Старю Сэрбію, бо яны і для яе смачны.

Усе надзеі і вочы і сэрцы палудзенных славян звернуты на Расею. Расейскае грамадзянство шлець туды дактароў, лазарэты, сясьцёр [illegible], і шлюць грошы на падмогу. Хаця расейскіе дыпламаты і стараюцца угаварыць Аўстрыю не мешацца у завіруху, але захватные думкі аўстрыякоў шыты белымі ніткамі і, што чэкае Расею і якое яна займець палажэньне у гэтай пачынаючэйся небаспечнай завірусе ніхто ня можэ згадаць.

### З заграніцы.

Ў апошнім нумэры мы пісалі, як кітайскі урад пачаў завадзіць парадкі ў Монголіі, каторая падчас рэволюцыі адарвалася ад Кітаю і абвесьціла сваю незалежнасьць. Цяпер „Агенства Далёкаго Усходу“ дае дужа цікарые весткі аб тым, якімі спосабамі Юаншыкай—самы глаўны ў Кітаі—рупіўся прыцягнуць на свой бок монгольскіх князёў.

Гэтак 22 верэсьня загадаў ён даць вышэйшы чын кожнаму з верных Кітаю князёў. Шляхта дастала тытул графоў, графы—маркграфоў, маркграфы—герцогоў, герцогі—князёў. Відаць, гэта зрабіла свае: у самы найгоршы момэнт князі асталіся вернымі Кітаю. Увесь аддзеленчэскі рух у Монголіі—гэта справа толькі князёў; простаму народу ўсё роўна: быць пад Кітаем, ці жыць асобне. Дзеля таго, як пастановяць князі, так і будзе. У справах національнай рады Кітай зрабіў вялікіе уступкі. Цяпер Монголія мае роўные правы поруч з іншымі 22 кітайскімі старонкамі; ўсе тытулы, прывілеі князёў і т. д. забэспечэны кітайскім урадам; у унутрэніх справах Монголіі Кітай рахуецца з думкамі і пастанаўленьнямі князёў; монголы, што знаюць расейскую мову, могуць быць на гасударственай службе, у войску і т. д. За тое войскам і загранічнай палітыкай мае загадываць глаўны кітайскі урад. Такім парадкам Юаншыкай зрабіў тое, што Монголія цяпер ужо не асобнае нэзалежнае гасударства, каторае мела права шукаць апекі ў Расеі, але толькі адна с кітайскіх старонак, што, хаця мае асобнае самоўпраўленьне, павінна залежаць ад аднаго агульнаго кітайскаго ураду. І цяпер Расея ня можэ ўмешывацца ў справы Монголіі.

## Гулі.

У якую пару года гэто здарылося можэ кожын сам дагадацца, калі я толькі скажу, што гэто здарылося у тую пару, калі сонцэ кожын дзень па ступенцы падымалося, ўсё вышэй, пасьля амаль-што не поўгадоваго адпачынку і будзіло усё на сьвеці. На гэта яно першым дзелам сцягнуло белую коўдру са спячэй зямлі і пачало яе разматруніваць, упіраючы прама у твар сваімі востра-яснымі і шчакотна-цёплымі праменямі. Было гэта тады, калі усё на сьвеці ад малёханькай мошачкі да аграмадных стварэньнеў старалося праявіць сябе: земля сваей лашчучай вока зеленьню, вада сваім дзелавітым шумам, лес сваім важным вялічыем, птушкі сваімі песьнямі, людзі сваей дбаласьцю, дзеці сваей безклапотнай рэзвасьцю...

У гэту пару Піліпавы дзеці гулялі на падворку пад растаропным кірункам Хведзі, старшаго хлопчыка гадкоў 8. Сягоньня Хведусь задумаў устроіць асобна цікавую гульню, вось ён і загаманіў да меншых.

— А ведаеце, дзеці, у што мы сягоньня будзем гуляць? І тут-жэ сам атказаў:—Будзем гуляць, як Габрусь с Проскай жаніліся.

У прыдумках гульнёў дзеці с Хведусем ніколі не спіраліся.

І ён доўга ня думаючы пачаў жыва тламачыць, як трэба будзе гуляць.

— Ты, Ганула, (дзяўчынка пад Хведусем) за Марью, Просчыну матку, Сёмка за Габруся; Паланея (самая меншая) за Проску. А я сперша буду за Івана, Габрусёваго бацьку, а пасьля за Язэпа, свата Габрусёваго. І пачнем с самаго пачатку, як і было у Габруся с Проскай. Ты Сёмка сперша старайся зачэпаць як небудзь Паланею, дзе толькі напаткаеш яе: ну раз, там, сарві хусціну з галавы, абстрыкай лыдкі крапівай, ці заляпі галаву дзедамі. Яна с табой сперша павінна лаяцца, а посьле схопіць палку, ды кінецца за табой. Ты тады зроб прыклад, што баішся і схапі яе бытцым атбіраючы палку, а сам, як можна дольш не выпускай і клыч яе. Другі раз улучы, бытцым не знарокам, ушпурнуць яе у лужыну і тады, хоць яна будзе лаяць і залепіць цябе гразьзю, ты яе выцягні і памажы абчысьціцца. А там, мо ты і сам што прыдумаеш.

— А ведаеш, чым я яе ешчэ зачаплю?—бойка атказаў Сёмка.—Я ей вірабья запушчу у валасы, ці жабу сцюдзёную за каўнер кашулі! Гэта слаўные штукі і я бачыў як іх робяць.

Паланея учуўшы, што збіраюцца ей запусьціць жабу за каўнер кашулі зацягнула:

— А-а-а я нябуду гуляць у гэту гульню!

— Гэта-ж не запраўды, а сьмехам, Паланейка! Угаварываў яе Хведусь. І звярнуўся ізноў да Сёмкі:

— О, гэта важные штукі. Ты ўсётакі маладчына! І вось гэткім зачэпаньнем вы, малапамалу і агэлтаецеся адзін каля другога, а тады ты ўжо, бытцым, хадзі і ў хату к ім вечэрамі. Там, гэтак сама, час трэба праводзіць не дарма, а старацца скарыстаць з яго: вось ты, калі яна будзе бытцым прасьці, пакажы ей, як зайчаняткі зімой грэюцца каля сваей маткі і выбій кудзелю с прасьніцы, ніткі ірві, скідывай, бытцым, шнурок с караўлота. Адным словам, што яна там будзе рабіць, дык ты павінен прыдумаць, як за што зачапіцца.

— Ды што там! Я знайду чым зачапіць. Заахвочэны першай пахвалой прагукаў Сёмка,—Вось, хоць-бы сабе яна будзе ісці, а я, торк, падстаўлю нагу і яна паляцела носам у зямлю, а будзе садзіцца, то я скорэнька, торк, падстаўлю што небудзь вострае ей. Я думаю што гэта лоўка выйдзе?!

— Ого, ды як ешчэ! Во, будзе цікава. Ты, ўсёткі, і запраўды зух у гэткіх справах, як вялікі дзяцюк!—Хваліў Хведусь Сёмку.

— Гы, не дармо я падцікаўлю усякую штуку. Ад мяне ужо не украдуцца. Я ўсё сабе наматаю на вус.

А Паланея ізноў пацягнула, што яна ня хочэ у гэта гуляць, але яе перабіла Ганула сказаўшы, што ей нічога ня будзе і каб яна не мешала Хведусю тлумачыць.

— Паланея,—казаў с павагай далей Хведусь—заздзірбнутая за сэрцэ табой, павінна с свайго боку табе ўзаемнасць аказываць: ці вымажэ сажай, абліець памыйкамі, а не то і ў хрыбет накляўшыць. Вось ужо пасьля гэтаго вы сусім збліжыцеся і прывыкнеце адзін

ваць сваю прыналежнасць да слаўнаго беларускаго народу.

Браты беларусы! страсайце з сябе пагарду, якой закідалі наш народ, паднімайце яго з упадку, у якім знаходзіцца ён цяпер, будуйце сьветлую будучыну вашым дзецям і ўнукам, ня слухайце цкаваньня брата на брата,—а калісь за гэта успамянуць вас добрым словам будучые пакаленьня.

**В—т.**

## Песьня—звон.

Гэй, ты маці родна мова,
Гэй ты звон вялікі слова,
Звон магучы,
Звон бліскучы,
С срэбра літы,
З злота збіты
Заграмі ты
Загрымі!

Гэй званар, званар мой пане,
Бій у звон, як змогі стане,
Без спачынку,
Без упынку,
Потам зліты,
Ім умыты,
Бій звані ты,
Бій звані!

Гэй гусьляр, песьняр мой браце,
Грай сьпевай у полі, ў хаце,
Дзе гарота,
Дзе галота,
Дзе ня сыты,
Дзе ня ўмыты.
Ім спыні ты,
Жаль спыні!

Струны хай брыняць і рвуцца
З болю, з гневу. Хай сьмяюцца
Разам з імі,
Не чужымі.
—Голас чысты,
Залацісты,
З імі злійты,
З імі злій!...

**Алесь Гарун.**

## Карысная работа.

Цяпер, як пачалі селяне перэхадзіць на хутары, прыкмечэна дужа цікавая рэч. Гэта тое, што там, дзе толькі знаходзіцца больш хутароў, пачынае зменшацца пьянства. І бывае, што манаполька ня толькі менш таргуе, як даўней, але нават прыходзіцца яе зусім зачыняць, бо ўжо німа казне ніякаго рахунку прадаваць там тую атруту: не аплачываецца. Гэтак, як сяло Основа ў Харкоўскім павеці разбілося на хутары, то заместа 6.170 вёдзер, якіе даўней выпівалі, прададзена праз год толькі 4,311 вёдзер (—Хаця і гэта ешчэ шмат!). Ізноў у Дрыцанскай воласьці, дзе меншая палавіна вёсак (32 з 79) перэйшла на новы способ гаспадаркі, ў 1911 гаду прададзена 658 вёдзер заместа даўнейшых 926. А ў вёсцы Шчэжэры, Магілеўскай губэрні, пасьля пераходу, зусім трэба было скасаваць манапольку, бо не было больш ахвотнікоў да гарэлкі.

Гэтые прыклады паказываюць, што пераход на хутары, апрача іншай карысьці, аб каторай мы ўжо нераз пісалі, мае ешчэ і тую вагу ў жыцьці нашаго народу, што зменшаецца пьянства, а, значыцца, памаленьку зводзіцца і ўсё тое благое, што ідзе ад гарэлкі. І дзеля таго мы ешчэ гарачэй павінны вітаць кожнаго селяніна, што маніцца выдзяліцца з вёскі, бо тым самым прыкладывае ён руку ня толькі да падняцьця багацьця але і да моральнаго і фізычнаго аздароўленьня нашаго народу.

і—м—і.

## З Беларусі і Літвы.

*(Ад ўласных карэспандэнтоў).*

**Сярэднікі**, Мінск. губ. Слуцк. пав. Як пайшоў ад 15 аўгуста дождж, дык ішоў да 10 верэсьня і не даваў сеяць жыта, а посьле перэстаў дзён на тры і нашы мужыкі не глядзя на тое, што земля надта мокрая сеялі жыта. 15 верэсьня ударыў прымаразак, то жыта, каторае пусьціло расток замерзло. 25 верэсьня выпаў у нас вялікі сьнег і захапіў на полі многа бульбы. Памешчыкі, каторые наймаюць выбіраць бульбу, плацяць па 70 капеек у дзень. Авёс плацяць у нас па 1 р. 10 к.; пшаніцу па 90 кап.; ячмень гэтак сама па 90 кап.; жыта па 85 капеек.

*Х. Гапановіч.*

**Г. Вілейка**, Віленск. губ. Трэба было выбраць 8 выбаршчыкоў у губэрню ад рускаго населеньня. Прыехало 54 чэлавекі. 13 сьвяшчэньнікоў, 38 мужыкоў, 2 большые памешчыкі, і 1 ад дробных землеўладзельцоў (А. Ўласоў рэдактар „Нашай Нівы“).

А. Ўласоў ешчэ не выходзіў з заезду, як ужо сьвяшчэнікі цэлую раніцу угаварывалі мужыкоў, каб нізашто не выбіралі яны рэдактара, бо ён, дадавалі некаторые, падкуплен жыдамі і палякамі і ён пагубіць народ і увесь край, калі яго выберуць. Але большая часць мужыкоў і духоўных ешчэ не бачыла у вочы Ўласава, так, што нават вышла маленькая камэдія: калі накінуліся на аднаго мужыка, палічыўшы яго за „гэтаго страшнаго ворага“—рэдактара беларускай газэты.

Калі Ўласоў прыйшоў у з'езд, то на дварэ стаяла грамада мужыкоў, з імі гарача разгаварывала пара сьвяшчэнікоў, рэшта стаяла на ганку зьезда; паздароваўшыся са сьвяшчэнікамі і выбарнымі ад валасцей, пасьля цікавых размоў, аб „Нашай Ніве“, рэдактар заявіў спакойна і дэлікатна сьвяшчэннікам, што хаця пры гэтых выбарах ён „палітычны вораг“ тэй парціі пад камандай каторай сьвяшчэннікі ідуць на выбарах, але ён ніякай ганьбы ні рэлігіі, ні асобам сьвяшчэннікоў не рабіў і ня робіць, і дзеля таго, просіць ніякіх фальшывых гутарак і непраўды у ход не пускаць. Трэба прызнаць, што духавенство зразумело гэта і кінуло чорнасоценны способ агітацыі, абчэрніваньне асобы праціўніка не было, апроч двух сьвяшчэннікоў, належачых да „саюзу рускаго народу. Бо адзін чэлавек можэ мець свае палітычные пагляды і думкі, другі свае, але за гэта ганіць і лаяць другога ніхто не павінен.

Усе крануліся і увяйшлі у зьезд, прэдседацель прачытаў законы і спытаўся, хто хочэ станавіцца кандыдатам; усе захацелі. Тагды па парадку кожын станавіўся, але ніхто адзін другога ня ведалі, бо прэдвыбарнаго сабраньня не было і кожнаму хацелося самому трапіць. Ніхто недастаў патрэбных 28 галасоў. Мужыкі пастанавілі гэты дзень зрабіць толькі пробные выбары; гэта нудная работа цягнулася гадзіны чатыры. Нікога ня выбралі. Выбары адлажылі на заўтра, усе заморэные разыйшліся.

Вечэрам ужо стала відаць якіе людзі сабраліся. Сьвяшчэннікі прывязлі с сабой сваіх мужыкоў, каторых яны угаварылі трымацца з імі. Чэлавек 10—12 мужыкоў было добра развітых і чытачоў „Нашай Нівы“. Паміж сьвяшчэніцкімі мужыкамі і гэтымі сьвядомымі было з дзесятак людзей, каторые былі ні туды ні сюды, ці па цэмнаце свaей, ці прама дбаючых не аб грамадзкай карысці, а абы самаму трапіць. Вечэрам па заездах гаманілі выбаршчыкі. Левая палавіна хацела выбраць 7 мужыкоў і А. Ўласава, правые хацелі, каб было выбрана і духавенства, падгаварывало на сваю старану. Кончылося тым, што на другі дзень ужо ясна было, што мужыкі еднасьці ніякай немаюць. Адны аткрыта гаварылі за 7 мужыкоў і Ўласова, другіе проціў, а трэцьціе па беларускай прывычцы слухалі усіх, але ня можна было зразумець куды яны прыстануць. Мужыкі зварычывaліся да Ўласова за радай, і ён ім казаў, што яны яго могуць і не выбіраць, абы толькі выбралі 8 чэлавек людзей сьвядомых і каб яны разам трымаліся. За гадзіну да выбароў Уласоў парадзіў мужыкам, каб яны паставілі колькі кандыдатоў і за іх кідалі галкі, і выбраўшы такім спосабам 8 чэлавек цьвёрда і дружна іх выбралі, бо ад спороў толку ня будзе. Тагды на Ўласова накінуліся колькі правых мужыкоў, а Сымон Маханік з Жосянскай воласьці і Тодар Шадыра з Даўгінава нават пачалі гаварыць крыўдные і несправядлівые рэчы на Ўласова. Тут жэ сьвяшчэннік о Васілій Забрудны з Крайскай воласьці сказаў цэлую мову, нападаючы на А. Ўласава і даводзячы, што правые хацелі зрабіць у Трэцяй Думе добрые законы, але левые ім непазволілі. Пакуль ішлі сваркі час страцілі і пайшлі выбіраць незгаварыўшыся. Кідалі галкі, значыць, не згаварыўшыся, а як хто ўздумаець. Выбралі сьвяшчэнніка о. І. Левіцкаго з Дунілавіч, (саюза рускаго народу), сьвяшчэнніка з Лебедзева о. І. Недзельскаго, і ад мужыкоў Благовешчэнскі, Балаш, Гунько, Малько, Иващенко, Норейко. Большая часць мужыкоў партіі сьвяшчэннікоў.

*Выбаршчык.*

**Пагост**, Віленск. губ., Дзісенск. павету. Як і усюды і у нас адбыліся выбары упоўнамочэных ад валасьцей на выбары у Думу. У назначэны дзень сабраліся селяне у воласць у тым ліку і сьвяшчэнік наш, каторы разам с Крышталевічам, председацелем валаснога суда перэмаглі 50 чэлавек, каторые нехацелі выбіраць сьвяшчэніка, а хацелі выбраць Міхалёнка з вёскі Стары Пагост. Міхалёнак убачыўшы, як яны азьвярэлі на яго, пабаяўся і адказаўся, сьвяшчэнік гэтаму абрадаваўся, хоць не было чаго, бо некаторые граматные селяне адмовіліся падпісаць прыгавор. Стыдна было слухаць якіе нападкі сыпаліся ад селян на сьвяшчэніка, але ён удаваў бытцым нічога ня чуе З усяго відаць было, што яму дужа хацелося быць упоўнамочэным ад селян, каб, Барані Божэ, у Думы не папаўся такі чэлавек, каторы-бу там заступіўся за свайго брата-мужыка. Другога уноўнамочэнаго выбралі такі селяніна, гэтак сама і каталікі выбралі селяніна.

Нова-Пагостскі старшына, Васюцёнак, растраціў з валасной скрынкі 700 рублёў грошы. Земскі яго выгнаў вон і ён цяпер пад сьледзтвам і апісалі усю яго маетнасць,

---

уцяміць, а я то ўжо нічога не упушчу і вось мы цяпер усё гэта зробім.—Атказаў Хведусь і далей тлумачыў.

— Ну вот вы будзеце кнішкацца, не чэкаючы скора мяне з гораду, а я тым часам неўспадзеўкі і торк прыехаць і праз вакно убачу Сёмку с табой. Я тады хутчэй у хату. Сёмка-ж тады павінен уцячы, каб я яго не злавіў, а я табе за такога госьця паддам лаянкай і палкай у перамешку. Ты тады павінна клясьціся, начым сьвет стаіць, што у цябе нікога не было. Але гэта не паможэ, бо я сам ачэвідзь бачыў. І я зраблюся за думлівым, сярдзітым і пачну ізноў у карчму хадзіць, піць гарэлку. Праз нейкі час я ізноў збяруся, бытцым, зьездзіць да сястры (цёткі Ганулі) і там начэваць. А у гэту ноч Сёмка ізноў павінен прыйсці, да цябе у госьці. У вас ізноў пойдуць пачастункі і дуры. А я тымчасам, бытцым, троху ад'ехаўшы, трах, і вярнуся дамоў; ды ужо ціханька падкрадуся, кінуўшы каня водаль і як абачу, што ізноў Сёмка у цябе, дык як зьвер ірвануся ў хату, схапіўшы прыгатаваны перад выездам тапор. Сёмка у гэту хвілю павінен прытуліцца у памельніку, бытцым няўспеўшы уцячы, а ты застановішся пасярод хаты. Я нічога не разважаючы, нават бяз слоў, рынуся проста ня цябе замахнуўшыся тапаром, каб зразу на мейсцы аблажыць, разсекшы папалам. У гэту самую апошнюю хвілю Сёмка павінен выскачыць с памельніка, схапіць мяне за рукі і атабраць тапор. Я тады з немым рыкам схаплюся за Сёмку, стараючыся улучыць, каб яго задушыць, але ён, бытцым здаравей за мяне (як і запраўды Грыгор за тату), як сцісьне, ды страхане мяне, дык я і ўслаблю яму. За гэту хвілю ты ачухаешся ад абмярцьвіўшаго цябе упуду, убачыўшы тапор над галавой і падскочыўшы на помач Сёмку, скруціце мяне зусім. Посьле гразя мне, гэтым самым тапаром, загадаеце мне прысягнуць, што нікому не скажу аб гэтым да веку, іначэй засячэцё, мучучы мяне, тапаром. Самі-ж абецаеце мне, што паміж вас больш гэтаго ня будзе. З гэтаго часу я бытцым алунею, адрашуся зусім ад гаспадаркі, буду бязвыхадна сядзець у карчме і безперэстанку гарэлку піць, нікога ня буду слухаць і сам ні скім гукаць ня буду. Ну гэтакім зраблюся, як цяпер і запраўды наш тата.

На гэтым Хведусь закончыў тлумачыць і пачалі гуляць. Для ўсіх дзяцей гэта гульня паказалася надта цікавай і яны усе стараліся акуратна яе выпоўняць, а пад энэргічным, растаропным кірункам Хведуся, яна выхадзіла жыва і хлёстка.

Дайшло ужо да таго, як Хведусь вярнуўшыся з дарогі к сястрэ, злавіў Сёмку з Гануляй і бытцым ахвачэны шалам злосьці, схапіўшы тапор уляцеў у хату і замахнуўшыся ім рынуўся на Ганулю (тапор быў запраўдашні, цяжкі). Гэту выхадку Хведусь хацеў асабліва хлёстка, с парушаючым эфэктам правясьці. Ен крэпка загарачыўся і ў гэтай гарачцы зачапіўся за нешта нагой і з імпэтам паляцеў наперад, валючыся прама на Ганулю, так, што Сёмка неўправіўся схапіць яго, каб утрымаць, а сам ён ня мог нікуды скіравацца, ні скіраваць тапор, каторы з розмаху так і ўлез прама у Грудзі Ганулі стаяўшай на сваім мейсцы і нечэкаўшай гэтаго. Яна толькі крыкнула нема і мякнула аб зямлю абліваючыся крывёй с тапаром у грудзёх.

Чыя тут віна?...

**К. Олехновіч-Чэркас.**

але ён кажэ, што і пісар Буйка, каторы цяпер увольнены, памагаў яму гаспадарыць у валасной скрынцы.

У нас, як толькі суды у валасьці, то судзьдзі зьбіраюцца у карчму разам с прадседацелем і пачынаецца пьянство, а пасьля пераходзяць да Янкеля і там ужо запіваюць півам. Само сабой, што справядлівасць уся робіцца у карчме, а толькі форма у валасьці.

*Пагашчанін.*

**Гарманавічы**, Віленск. губ. Дзісенскаго павету. У вёсцы Шышкі у панядзелак 17/IX, адзін тутэйшы селянін К. Шышка, са сваей дачкой і жонкай атправіліся за вярсты дзьве у наёмку, выбіраць бульбу, пакінуўшы хату сваю с чатырмя дзяўчынкамі, ад аднаго да 8 год. Як вярнуліся вечэрам дамоў, доўга шукалі дзяцей па вёсцы, пакуль не дадумаліся паглядзець у куфры, там іх усіх чацьвёра знайшлі мёртвымі. Відаць, што дзеці, гуляючы, паўлезаўшы закранулі неяк века, каторае сашчэкаўзнуўшыся зачынілося і клямка заскочыла на прабой. Куфэр быў шчыльны і дзеці падушыліся у ім без паветра. *Д.*

Засьценак **Станулёва**, Віл. губ. Дзіс. пав. Тутэйшые жыхары наладзілі на магільніку хаваць бульбу. Што-ж добра: — пясочэк. Але калісь што здарылося мне паглядзець на гэты ямы: у ямах часта косьці тарчэлі, а у аднэй і цэлую галаву убачыў. Сказаў я ім, што гэтак ня гожэ рабіць, каб дзеці над касьцьмі сваіх бацькоў здзекаваліся.

Вёска **Баброўшчына**, Дзіс. пав. Між вазёр і некаторых рэчак цягнуцца на колькі вёрст акопы: нейкіе даўнейшые крэпасьці. Шмат знаходзіцца карыстлівых людзей, каторые шукаюць там закапаных грошы. Дзе-ж яны там знайдуць тое багацьце, калі ня ведаюць скуль узяліся тые акопы і валатоўкі, дык нашто раскідаць косьці старых ваякоў? Знаходзяць тут, як казалі медзяные абручы са званочкамі і рожнае аружжэ саржавеўшае жалезнае.

Двор **Каменпольле**, Дзіс. п. Калісь што даўней каля крыніцы стаяла тут капліца. І людзі кідалі грошы у гэту бузу на ахвяру. Цяпер капаючы канавы ўладзелец выкапаў канаву да самай крыніцы і атправіўшы работнікоў, выдабываў з бузы старасьвецкіе медзякі. Кажуць, што ўладзелец мае ахвоту пабудаваць тут новую капліцу.

*Дроздовіч.*

**З Гродзеншчыны**. Перад выбарамі у першую Думу кожны цікавіўся, нават і вясковые бабы аб ей гаварылі і ждалі ад яе палепшэньня жыцьця; другой гэтак сама цікавіліся, у трэцюю Думу ужо страцілі веру, а аб чацьвёртай Думе ніхто ужо не цікавіцца і не гаворыць. Усё замёрла і застыгла. Наш гарапашнік мужык ано патыліцу скрабе і ўздыхае. Яму ведама доля першых двох Дум і карысць Трэцяй Думы. Хаця ён не чытае газэт, але ён чуцьцём чуе, дзе карэнь яго нешчасьця. Ен зразумеў, што цемната усяму віной; але як яму ад цемнаты збавіцца калі школ у нас мала. Аткрыць у вёсцы школу надта цяжка. Перш наперш трэба напісаць грамадзкі прыгавор і каб у ём было напісана, што мужыкі даюць для школы дзесяціну зямлі, стоража, апал, асьвятлене, будуць папраўляць школьны будынак і каб той прыгавор пасьведчыў земскі начальнік і заверыў, што мужыкі не маюць заработкоў, малазямельные, тагды вучэбнае начальства, пасьля вялікай валакіты і перапіскі і калі грамадой сасчасьціцца вывезьці з лесу дрэва, аткрывае школу, а тымчасам грамада на сваe грошы наймае хату. Ведама якіе у вёсках хаты: тры чатыры малых вокны, без падлогі, а у кутку стаіць вялізарная печ, каторая занімае поўхаты. Гэта завецца дачасная школа, у каторую сабіраецца 50—60 дзяцей і у ей дзеці ня вучацца, а мучацца, хварэюць ад недастачы воздуха, хварэюць на вочы, а вучыцелі у пяць-шэсць лет дастаюць сухоты, або на ўсё жыцьцё трацяць здароўе. Вось якая над людзьмі апека. Ня дзіва, што просты чэлавек ня верыць цяпер ні вашто і ва ўсім відзіць ашуканства і недбальства аб яго карысьці. Нет ведама як чацьвёртая Дума будзе рупіцца аб жыцьці бедных зюдзей.

*Дзед* **Міхась.**

**Ад Рэдакціі.** Папраўляем абмылку у карэспандэнціі „Тутэйшаго“ з г. Радашковіч у № 39. Пан Грыгаровіч бабу толькі лёгка зраніў, як ён кажэць няўмысне, і ён нікуды не уцекаў пасля.

## З усіх старон.

**Пецербург.** Іліодар прыслаў міністру юстыціі (судоў) Шчэглавітаву жалабу на тое, што „здзекі манастырскаго начальства і стражнікоў, каторым патурае эпархіальнае начальства, набірае угалоўнаго характару“. Разам з гэтым Іліодор прыслаў лаючы ліст Саблеру, обэр-пракурору сьвяцейшаго Сыноду, дзе між іншым радзіць яму „ня ўцягіваць архірэёў і сьвяшчэньнікоў у брудную палітычную ігру“. Сынод пастанавіў зняць з Іліодора духоўнае званьне да часу.

= На адным з апошніх заседаньнёў Сыноду разглядалі справу аднаго протоірэя і вучыцеля цэркоўнай школы, каторые на выбарах у 4 Гас. Думу голасна заявілі, што яны прогрэсісты. Прозвішчэ гэтых асоб Сынод не выяўляе. Адны з ерархоў радзілі іх добра такі пакараць, а іншые—не чэпаць, каб ніхто не нарэкаў на Сынод.

= Кажуць, што маюць аднавіць Сахалінскую катаргу дзеля таго, што усе вастрогі у Сібіры перапоўнены.

**Масква**. У Маскве гасьціць цяпер скінуты португальскі кароль Мануэль. Жыве ён пад прозвішчэм граф д'Опорто. Жыве ён дужа вясёла. Штодня бывае у тэатрах, рэстаранах у вясёлай кампаніі гуляк.

**Холм.** Холмскае праваслаўнае брацтво, каторае так дабівалося разам з епіскопам Евлогіем, каб выдзеліць Хомшчыну у асобную губэрню затым, што там бытцым расейскі народ,—цяпер агледзілося і паслало вырабіўшы праект, каб усе работы пры казённых будоўлях аддавалі работнікам з Расеі, з умовай, каб гэтые работнікі пасьля пасяліліся у Холмі, бо бытцым, усе работнікі мейсцовые (украінцы) ужо апалячыліся, дзеля гэтаго на Холмшчыну трэба прывязьці праўдзівых расейскіх работнікоў.

**Рыга.** У Рызе ад першаго чысла гэтаго месяца пачаліся акадэмічные сьвятые с прычыны 50 летняй гадоўшчыны аткрыцьця рыжскай політэхнікі.

**Варшава**. Сёлетніе выбары у Варшаві адбыліся цікава: перэвагу галасоў мелі жыды і калі-б жыды захацелі маглі-б непусьціць паляка у Думу, але жыды баяцца гэтак зрабіць, каб пасьля гэто, як кажуць,—бокам ня вылезло“. Ад расейскай курыі у Варшаві выбралі чорнасоценцоў.

Рэдактар-Выдавец
**А. Ўласоў.**


Приймається передплата на 1913 рік
НА УКРАЇНСЬКУ, ЩОДЕННУ ГАЗЕТУ

„РАДА“

**РІК ВИДАННЯ СЬОМИЙ**
ГАЗЕТА ПОЛІТИЧНА, ЕКОНОМИЧНА І ЛІТЕРАТУРНА.
**Виходить у Київі що-дня опріч понеділків і днів після великих свят**

„Рада“ має широку програму, як звичайні великі політичні газети: дає огляди життя політичного, громадського, економичного **на Вкраїні, в Россії і за-границею**; друкує фельетони, а також статті критичні і твори красного письменства.

**Ціна „Рады“ на рік 6 карб.** Передплату можна виплачувати частками в такі строки: на 1 янв. 3карб. і на 1 апр. 3 карб. в 3 строки: на 1 янв. 2 карб., на 1 марта 2 карб. і на 1 мая 2 карб., або по 1 карб. що місяця впродовж першого півріччя.

ЗМІНА АДРЕСИ—30 к., артистам і учням всіх шкіл—БЕЗПЛАТНО.

**Адреса редакції і головної контори: у Київі, Велика-Підвальна вул. д. 6, біля Золотих Воріт. Телефон 1458.**

Редактор **В. Яновський** Видавець **Є. Чикаленко.**



Ужо друкуецца і скора выйдзе

БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР на 1913 год.

Нашых агентоў і асоб, каторые бяруць на продаж, просім загадзя прысылаць заказы на календар.



„НАША НІВА“
Прыймаецца падпіска на 1913 год.

**Гэта люстро душы, думак і патрэб Беларусі.**

Усе, каму дорага будучына нашаго народу і нашай старонкі, выпісывайце, чытайце і шырце паміж людзей газэту у сваей роднай мове

Каштуе „Наша Ніва“ на год усяго толькі 2 руб. 50 кап.
На поўгода 1 руб. 25 кап.



„САХА“
Першы беларускі месячнік сельскай гаспадаркі

«САХА» дае практычные рады па ўсіх аддзелах сельскай гаспадаркі, дастасаваные да нашых варункоў і клімату

**ПАДПІСНАЯ ЦЭНА:**
На 1 год . . . . . 1 руб. 20 кап.
на 6 месяцеў . . . — » 60 »

Цэна асобнаго нумэру 8 кап., з дастаўкай да хаты 10 кап.

**Пробны нумэр высылаецца дарма.**

*Адрэс рэдакцыі: Вільня, Завальная 7.*—Рэдактар-выдавец **А. Ўласоў.**


Друкарня Марціна Кухты, Татарская, д. № 20.